# УЗНАГАРОДЫ ДА ДНЯ НАВУКІ

Пазаўчора адбыўся савет універсітэта, на якім, як заўжды, абмяркоўвалі шэраг надзённых пытанняў, што датычацца работы ВНУ. Але на пачатку пасяджэння рэктар А.У. Ягораў павіншаваў усіх прысутных з надыходзячым святам – Днём беларускай навукі і пажадаў плённай навуковай працы, цікавых адкрыццяў, дабрабыту і здароўя.

З нагоды свята супрацоўнікам і выкладчыкам універсітэта, якія дасягнулі найбольш высокіх паказчыкаў у развіцці навукі і інавацыйнай дзейнасці, падрыхтоўцы навуковых супрацоўнікаў вышэйшай кваліфікацыі і студэнцкай моладзі, Аляксей Уладзіміравіч уручыў наступныя ўзнагароды: Ганаровую грамату Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь – кандыдату гістарычных навук, дацэнту кафедры гісторыі Беларусі **Таццяне Станіславаўне Бубенька**; Грамату Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь – прафесару кафедры алгебры і методыкі выкладання матэматыкі, доктару фізіка-матэматычных навук, дацэнту **Мікалаю Мікалаевічу Вараб'ёву**.

Ганаровымі граматамі Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь былі ўзнагароджаны: доктар біялагічных навук, прафесар, прарэктар па навуковай рабоце **Іна Міхайлаўна Прышчэпа** – за вырашэнне найважнейшых экалагічных праблем, распрацоўку і ўкараненне новых метадаў прафілактыкі захворванняў, а таксама за падрыхтоўку навуковых, навукова-педагагічных кадраў і высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі; кандыдат фізіка-матэматычных навук **Юрый Іванавіч Бохан** – за шматгадовую плённую працу і ўкараненне вынікаў навуковых даследаванняў у вытворчасць, у тым ліку за стварэнне навуковых асноў развіцця і распрацоўку новых відаў тэхнікі і тэхналогій, а таксама за падрыхтоўку навуковых, навукова-педагагічных кадраў і высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі.

Ганаровыя граматы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў былі ўручаны: кандыдату філасофскіх навук, дацэнту, дэкану юрыдычнага факультэта **Аляксандру Аляксандравічу Бачкову** – за навуковыя даследаванні, прысвечаныя фарміраванню прававой культуры сучаснай моладзі, паспяховае міжнароднае навуковае супрацоўніцтва і актыўны ўдзел у праектах БРФФД; кандыдату псіхалагічных навук, дацэнту кафедры прыкладной псіхалогіі **Наталлі Валянцінаўне Кухтавай** – за дасягненні ў навукова-даследчыцкай дзейнасці, паспяховае развіццё міжнароднага супрацоўніцтва і актыўны ўдзел у праектах БРФФД.

Ганаровай граматай Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь за актыўны ўдзел у рабоце па атэстацыі навуковых і навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі ўзнагароджана доктар філалагічных навук, прафесар кафедры агульнага і рускага мовазнаўства **Валянціна Аўраамаўна Маслава**.







Акрамя таго, за дасягненне высокіх паказчыкаў у развіцці навукі і інавацыйнай дзейнасці, падрыхтоўку навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі і студэнцкай моладзі восем чалавек атрымалі Ганаровую грамату ўніверсітэта, два – грамату ўніверсітэта, а шасці – была аб'яўлена падзяка ВНУ.

Да таго ж А.У. Ягораў уручыў пасведчанні аб прысваенні вучонага звання дацэнта **Ніне Веньямінаўне Вялічка** (па спецыяльнасці «Гісторыя»), **Святлане Васільеўне Мартынкевіч** (па спецыяльнасці «Педагогіка») і **Надзеі Сяргееўне Маторавай** (па спецыяльнасці «Гісторыя»), а таксама дыплом аб прысуджэнні вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук старшаму выкладчыку кафедры прыкладной матэматыкі і механікі **Сямёнаву Максіму Генадзьевічу**.

Віншуем!

**УЛАСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ.**
**Фота Настассі ЛАЗЕБНАЙ.**

**На здымках:** Т.С. Бубенька (злева); рэктар універсітэта А.У. Ягораў уручае А.А. Бачкову Ганаровую грамату БРФФД (справа); Н.В. Вялічка, С.В. Мартынкевіч, Н.С. Маторава.